Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік
Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ А. Г. Бахановіч
________________________________
Рэгістрацыйны № _________ / пр.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

## Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 6-05-0314-02 Культуралогія

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела ўстаноў
адукацыі
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
_____ ___________ М. Б. Юркевіч
_____________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_________________ С. М. Пішчоў
_____________________

Старшыня вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
_______________ Н. У. Карчэўская
_________________

Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце дзяржаўнай установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы»
_________________ І. У. Цітовіч
__________________________

Эксперт-нормакантралёр
___________________________
___________________________

Мінск 2026

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Т. Ф. Сухоцкая,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*кафедра* сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (пратакол № 10 ад 30.05.2025);

*А. Э. Салікаў,* загадчык кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ПРЫКЛАДНАЙ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 23.04.2025);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 25.06.2025);

*навукова-метадычным* саветам па культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці, сацыяльна-культурным менеджменце і камунікацыях вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 22.12.2025)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч

Адказны за выпуск: Т. Ф. Сухоцкая

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін» прадугледжана для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0314-02 «Культуралогія».

*Мэтай* дадзенай вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў прафесійных кампетэнцый у галіне выкладання культуралагічных дысцыплін, заснаваных на веданні сучасных методык, прынцыпаў і тэхналогій навучання і валоданні імі.

У працэсе выкладання вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін» адбываецца паглыбленне атрыманых ведаў па розных культуралагічных дысцыплінах і іх апрабацыя пры вырашэнні канкрэтных педагагічных задач; набыццё студэнтамі першапачатковага вопыту педагагічнай дзейнасці; фарміраванне прафесійных педагагічных навыкаў і ўменняў. Дадзеная вучэбная дысцыпліна закладвае навукова-абгрунтаваныя падыходы да педагагічнай дзейнасці, асновы індывідуальна-педагагічнага стылю.

*Задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– фарміраванне агульнага ўяўлення аб сістэме выкладання культуралагічных дысцыплін і іх месцы ў адукацыйнай сістэме УВА;

– азнаямленне з гісторыяй і сучасным станам методыкі выкладання культуралагічных дысцыплін;

– засваенне сучасных метадаў і тэхналогій выкладання культуралагічных дысцыплін;

– развіццё ў студэнтаў навыкаў распрацоўкі і правядзення розных тыпаў заняткаў па культуралагічных дысцыплінах (лекцыі, семінары, практычныя заняткі, экскурсіі, майстар-класы і інш.);

– фарміраванне ўменняў ацэньваць эфектыўнасць адукацыйнага працэсу і ўносіць неабходныя карэктывы.

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін» мае міжпрадметныя сувязі з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Педагогіка», «Сацыяльная і ўзроставая псіхалогія», «Тэорыя культуры», «Гісторыя культуры».

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0314-02-2023 па спецыяльнасці агульнай вышэйшай адукацыі 6-05-0314-02 «Культуралогія» вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных *універсальных кампетэнцый:*

– валодаць асновамі даследчай дзейнасці, здзяйсняць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі;

– рашаць стандартныя задачы прафесійнай дзейнасці на аснове інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

– быць здольным да самаразвіцця і самаўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці;

– праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да змен у прафесійнай дзейнасці.

Студэнты павінны набыць наступныя *базавыя прафесійныя кампетэнцыі:*

– прымяняць на практыцы асноўныя тэорыі навучання і выхавання, сучасныя педагагічныя сістэмы, разумець іх ролю і месца ў адукацыйным працэсе;

– вызначаць і прымяняць у прафесійнай дзейнасці сучасныя метады, формы, сродкі і тэхналогіі навучання і выхавання;

– улічваць у педагагічнай дзейнасці асаблівасці ўзроставага фізіялагічнага і псіхалагічнага развіцця чалавека на аснове сістэмных ведаў пра жыццёвыя этапы яго развіцця ў біялагічным, сацыяльным і псіхалагічным аспектах;

– здзяйсняць педагагічную дзейнасць у сферы мастацкай адукацыі, ствараць і прымяняць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і педагагічныя

інавацыі з мэтай асабістага, духоўна-маральнага, мастацка-эстэтычнага і прафесійнага развіцця;

– забяспечваць і ўдасканальваць педагагічную падтрымку развіцця і самаразвіцця навучэнцаў праз адаптацыі наяўных і ўкаранення новых методык навучання;

– выкладаць спецыяльныя дысцыпліны на высокім навукова-тэарэтычным узроўні, прымяняць метады і сучасныя методыкі навучання культуралогіі.

У выніку засваення зместу вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя варыянты структуравання культуралагічных курсаў;

– асаблівасці розных педагагічных тэхналогій, традыцыйныя і інавацыйныя формы вучэбных заняткаў па культуралагічных дысцыплінах;

– асноўныя патрабаванні да складвання прыкладных і вучэбных праграм, тэматычнага і рабочага планавання, якія прад’яўляюцца ў сучасных навучальных установах;

– методыку падрыхтоўкі і правядзення лекцый, семінараў, кансультацый, залікаў, экзаменаў, абароны курсавых і дыпломных работ па культуралагічных дысцыплінах;

– ствараць, аналізаваць, супастаўляць розныя адукацыйныя праграмы, дапаможнікі па прадметах культуралагічнага цыкла;

– рыхтаваць і праводзіць лекцыйныя і семінарскія заняткі;

– ствараць прыкладныя, вучэбныя рабочыя праграмы;

– выбіраць максімальна адпаведную форму заняткаў, спосаб падачы вучэбнага матэрыялу;

– збіраць, сістэматызаваць матэрыял да сваёй будучай педагагічнай дзейнасці;

*мець навык:*

– валодання методыкай распрацоўкі і правядзення заняткаў па культуралагічных дысцыплінах;

– валодання прафесійна-педагагічнай культурай і інавацыйнымі адукацыйнымі тэхналогіямі;

– дзелавых камунікацый у прафесійнай сферы;

– работы ў калектыве.

У межах адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіваць свой каштоўнасна-асабовы, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін» усяго прадугледжваецца 100 гадзін, з іх 62 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 16 гадзін – лекцыі, 22 – семінарскія заняткі, практычныя – 24.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі | практычныя заняткі |
| 1 | Уводзіны. Спецыфіка і змест культуралагічных дысцыплін | 2 | 2 | 2 |
| 2 | Тэарэтычныя асновы методыкі выкладання культуралагічных дысцыплін | 2 | 4 | 4 |
| 3 | Метады і тэхналогіі выкладання культуралагічных дысцыплін: традыцыйныя і інавацыйныя | 4 | 4 | 4 |
| 4 | Планаванне і арганізацыя адукацыйнага працэсу па культуралагічных дысцыплінах | 4 | 4 | 4 |
| 5 | Кантроль і ацэнка вынікаў навучання па культуралагічных дысцыплінах | 2 | 4 | 4 |
| 6 | Метадычныя рэкамендацыі аналізу культуралагічнага навуковага тэксту | 2 | 4 | 6 |
| | **Усяго…** | **16** | **22** | **24** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны. Спецыфіка і змест культуралагічных дысцыплін

Змест паняцця «культуралагічная дысцыпліна». Азначэнне і віды культуралагічных дысцыплін. Мастацтвазнаўчы, гісторыка-культурны, фалькларыстычны і іншыя кірункі ў сістэме культуралагічных дысцыплін. Прадметы і аб’екты вывучэння культуралагічных дысцыплін. Асноўныя катэгорыі і паняцці, тэрміналогія і тэматыка.

Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуралагічных дысцыплін.

## Тэма 2. Тэарэтычныя асновы методыкі выкладання культуралагічных дысцыплін

Прадмет, мэты, задачы і прынцыпы методыкі выкладання культуралагічных дысцыплін. Сувязь методыкі з педагогікай, псіхалогіяй, мастацтвазнаўствам, філасофіяй, сацыялогіяй, этнаграфіяй і інш. Унутрыкурсавыя сувязі.

Агульнадыдактычныя і спецыфічныя прынцыпы выкладання культуралагічных дысцыплін: навуковасць, даступнасць, нагляднасць, сістэматычнасць, паслядоўнасць, актыўнасць, сувязь тэорыі з практыкай, індывідуальны падыход і інш.

Станаўленне і развіццё методыкі выкладання культуралогіі. Асноўныя этапы і тэндэнцыі. Увядзенне культуралогіі як агульнаадукацыйнай дысцыпліны ў Беларусі. Падрыхтоўка культуралагічных кадраў. Навукова-метадычныя школы.

Псіхалагічныя асаблівасці навучання студэнтаў культуралагічнага профілю. Улік узроставых, гендарных, індывідуальных і сацыякультурных фактараў.

## Тэма 3. Метады і тэхналогіі выкладання культуралагічных дысцыплін: традыцыйныя і інавацыйныя

Класіфікацыя метадаў навучання: слоўныя, наглядныя, практычныя, рэпрадуктыўныя, праблемныя, даследчыя, інтэрактыўныя, дыстанцыйныя, развіваючыя, гульнявыя. Традыцыйныя метады навучання і іх характарыстыка: апавяданне, гутарка, тлумачэнне, дэманстрацыя. Актыўныя формы арганізацыі навучання і прыёмы іх рэалізацыі: дыскусія, ролевая гульня, кейс-стадзі, мазгавы штурм, дэбаты. Інтэрактыўныя навучальныя формы: праца ў групах, парная работа, круглы стол, прэс-канферэнцыя, «акварыум», «карусель», «мікрафон» і інш. Спецыфіка прымянення розных метадаў у выкладанні культуралагічных дысцыплін.

Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: тэхналогія праблемнага навучання, тэхналогія праектнага навучання, тэхналогія развіцця крытычнага мыслення, тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве. Гульнявыя тэхналогіі: дзелавыя, ролевыя, імітацыйныя гульні. Мадэль «канвеера» пры выкладанні культуралагічных дысцыплін. Арганізацыя адукацыі па сеткавым прынцыпе. Асновы модульнага навучання. Рэйтынгавая сістэма пры выкладанні культуралагічных дысцыплін.

Выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, методыка іх прымянення: мультымедыйныя прэзентацыі, відэаролікі, віртуальныя экскурсіі, інтэрнэт-рэсурсы.

Айчынны і замежны вопыт распрацоўкі і прымянення аўтарскіх методык выкладання культуралагічных дысцыплін.

## Тэма 4. Планаванне і арганізацыя адукацыйнага працэсу па культуралагічных дысцыплінах

Стварэнне добразычлівага асяродку для вучэбнай дзейнасці студэнтаў, стымуляванне пазнаваўчай цікавасці. Планаванне вучэбнага працэсу выкладання культуралагічных дысцыплін. Змест і структура вучэбнага плана.

Віды вучэбных праграм: прыкладныя, рабочыя і аўтарскія. Методыка стварэння вучэбных праграм. Структурныя элементы вучэбнай праграмы: тлумачальная запіска, змест вучэбнага матэрыялу, вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны, інфармацыйна-метадычная частка. Методыка распрацоўкі вучэбна-метадычнага комплексу.

Планаванне і распрацоўка вучэбных заняткаў па культуралагічных дысцыплінах: вызначэнне тэмы, мэт, задач, вызначэнне структуры заняткаў, выбар метадаў і прыёмаў навучання, выбар зместу вучэбнага матэрыялу, распрацоўка крытэрыяў ацэнкі ведаў студэнтаў. Арганізацыя і методыка правядзення розных відаў заняткаў: лекцыя, семінар, практычныя заняткі, лабараторныя, кансультацыя, азнаямляльная і вытворчая практыка, курсавое праектаванне, дыпломная работа і інш.

Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення лекцый па культуралагічных дысцыплінах: структура лекцыі, прыёмы актывізацыі ўвагі, выкарыстанне наглядных дапаможнікаў і мультымедыйных сродкаў. Распрацоўка плана-канспекта па канкрэтнай культуралагічнай тэме з улікам узроставых асаблівасцей і ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў.

Арганізацыя семінарскіх заняткаў: мэты, задачы, метады, формы працы. Віды практычных заданняў, патрабаванні да іх выканання. Вывучэнне культуралагічных тэкстаў у працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў. Падрыхтоўка пытанняў для абмеркавання. Каментарыі, даклады, дыспуты на семінарскіх занятках. Методыка арганізацыі дыскусіі. Абагульненне і заключнае слова выкладчыка. Формы кантролю і самакантролю на семінарскіх занятках па культуралагічных дысцыплінах.

Самастойная праца студэнтаў: спалучэнне і лагічная сувязь з аўдыторнымі заняткамі, творчы характар, даступнасць і займальнасць прапануемага матэрыялу. Асноўныя віды самастойнай працы: падчас аўдыторных заняткаў і падчас напісання студэнтамі рэфератаў, эсэ, навуковых артыкулаў, выканання курсавых, дыпломных работ. Арганізацыя ўліку і кантролю за самастойнай пазнавальнй дзейнасцю навучэнцаў.

## Тэма 5. Кантроль і ацэнка вынікаў навучання па культуралагічных дысцыплінах

Тэхналогія кантролю ведаў. Сродкі і формы кантролю (вусныя, пісьмовыя, практычныя, залікі, экзамены і інш.). Віды праверкі і ацэнкі ведаў (бягучы, тэматычны, выніковы) і іх функцыі. Метады кантролю: вуснае апытанне, пісьмовыя работы, тэсты, рэфераты, эсэ, праекты, прэзентацыі.

Формы ацэнкі ведаў. Крытэрыі ацэньвання ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў па культуралагічных дысцыплінах: структура адказу, змястоўнасць, навуковасць, арыгінальнасць, моўнае афармленне. Распрацоўка ацэначных матэрыялаў.

Спецыфіка распрацоўкі кантрольна-ацэначных матэрыялаў па культуралагічных дысцыплінах: заданняў, пытанняў, тэстаў.

Аналіз эфектыўнасці адукацыйнага працэсу і ўнясенне неабходных карэктываў. Распрацоўка і прымяненне дзяржаўных адукацыйных стандартаў па культуралогіі.

## Тэма 6. Метадычныя рэкамендацыі аналізу культуралагічнага навуковага тэксту

Аналіз культуралагічных тэкстаў як частка вучэбных заняткаў. Мэтанакіраванасць, навучальны і педагагічна арыентаваны характар аналізу. Агульныя патрабаванні да аналізу тэарэтычных і эмпірычных матэрыялаў: узбагачэнне новымі культуралагічнымі ведамі; фарміраванне аналітычных уменняў; развіццё навуковага мыслення, навукова-даследчых здольнасцей; выхаванне асобы.

Планаванне і распрацоўка заняткаў, складванне спіса навуковых прац, распрацоўка праблематыкі іх аналізу. Вызначэнне асноўных відаў аналізу: зместавы, структурны і тэхналагічны.

Непасрэдныя патрабаванні: асэнсаванае чытанне; разуменне сацыякультуралагічнага кантэксту разглядаемай з’явы ці працэсу; вызначэнне асноўнай сутнасці разглядаемай аўтарам праблемы.

Тыповы парадак аналізу навуковых тэкстаў: трактоўка навуковай працы; праверка правільнасці ўспрымання; слоўнікавая праца; складанне канспекта твора; уласны аналіз; падрыхтоўка тэзісаў; выступленне з інфармацыяй на занятках па выніках аналізу.

Спецыфіка крытэрыяў ацэнкі эсэ студэнтаў па культуралагічных работах.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Киселёва, О. О.* Педагогика высшей школы : учебник / О. О. Киселёва, Н. А. Патутина, Т. В. Сурнина. – Москва : ИНФРА-М, 2025. – 257 с. – URL: https:// znanium/ru/catalog/product/2170971.

2. *Леонова, П. И.* Методика преподавания культурологических дисциплин : учебно-методический комплекс / П. И. Леонова. – Минск : БГУ, 2014. – 103 с.

*Дадатковая*

1. *Болотова, Ю. Г.* Перспективы применения методов активного обучения в преподавании дисциплин культурологического цикла / Ю. Г. Болотова // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2008. – № 10. – С. 98–103.

2. *Глякаў, П. У.* Выкарыстанне метаду праектаў у падрыхтоўцы культуролагаў-менеджэраў / П. У. Глякаў // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2008. – № 10. – С. 103–109.

3. *Кандрашов, В. А.* Методика преподавания культурологии в вузе : учебное пособие [Электронный ресурс] / А. В. Кандрашов. – Ростов-на-Дону, 2012. – Режим доступа: https://samlib.ru/k/kondrashow_w_a/ocherk36.shtml.

4. Методика преподавания культурологических дисциплин : учебно-методическое пособие для студентов направления «Культурология» (магистратура) / сост. А. М. Субботина. – Ижевск : Издательство «Удмуртский университет», 2016. – 26 с.

## Метады (тэхналогіі) навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага рашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і другія актыўныя формы і метады).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання ўніверсальных і базавых прафесійных кампетэнцый студэнтаў універсітэта ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

У якасці аднаго з элементаў выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна-арыенціровачныя тэсты, якія ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданні на выяўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным альбо некалькімі суадносінамі і роўнай альбо рознай колькасцю элементаў варыянтаў; заданні адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданні на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца часткай вучэбнай дзейнасці і скіравана на замацаванне і паглыбленне атрыманых ведаў і ўменняў, самастойны пошук і набыццё новых ведаў. Яна скіравана на фарміраванне

навыкаў самастойнай работы ў вучэбнай, навуковай і прафесійна-педагагічнай дзейнасці.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў уключае асэнсаванне лекцыйнага матэрыялу, работу з нарматыўна-прававымі і вучэбна-метадычнымі дакументамі, пошук дадатковай літаратуры па тэмах вучэбнай дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх і практычных заняткаў і экзамену па дысцыпліне.

*Вучэбнае выданне*

**МЕТАДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН**

**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці 6-05-0314-02 Культуралогія**


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2026. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Лічбавы друк.
Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. . Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.